## PERFECTUM CONJUNCTIVI ACTIVI

Perfectum conjunctīvi actīvi (прошлы час закончанага трывання ўмоўнага ладу незалежнага стану) утвараецца ад асновы perfectum з дапамогай суфікса -ĕrĭ- і асабовых канчаткаў actīvi (незалежнага стану):

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Аснова perfectum** | + | **-ĕrĭ-** | + | **асабовыя канчаткі actīvi** |

З а ў в а г а. У 1 *sg*. канчатак -**m**.

**Асабовыя канчаткі actīvi**

| Асоба | Singulāris | Plurālis |
|---|---|---|
| 1-я | **m** | **mus** |
| 2-я | **s** | **tis** |
| 3-я | **t** | **nt** |

**Узор спражэння**
**laudo, āvi, ātum, 1 (аснова perfectum: laudāv-);**
**scribo, psi, ptum, 3 (аснова perfectum: scrips-)**

| Асоба | laudo, 1 — *хваліць* | scribo, 3 — *пісаць* |
|---|---|---|
| | Singulāris | |
| 1-я | laudav-**ĕri**-**m** | scrips-**ĕri**-**m** |
| 2-я | laudav-**ĕri**-**s** | scrips-**ĕri**-**s** |
| 3-я | laudav-**ĕri**-**t** | scrips-**ĕri**-**t** |
| | Plurālis | |
| 1-я | laudav-**erĭ**-**mus** | scrips-**erĭ**-**mus** |
| 2-я | laudav-**erĭ**-**tis** | scrips-**erĭ**-**tis** |
| 3-я | laudav-**ĕri**-**nt** | scrips-**ĕri**-**nt** |

З а ў в а г а. Формы perfectum conjunctīvi actīvi (акрамя 1 *sg*.) трэба трэба адрозніваць ад форм futūrum II indicatīvi actīvi, якія таксама ўтвараюцца з дапамогай суфікса -**ĕrĭ**-: laudav-**ĕri**-**s**, laudav-**ĕri**-**t** і г. д.

**Perfectum conjunctīvi**
**дзеяслова sum, esse — *быць* і вытворных**

Утвараецца, як у правільных дзеясловаў:

| Асоба | sum, fui, —, esse *быць* | absum, afui, —, abesse *адсутнічаць* | possum, potui, —, posse *магчы* |
|---|---|---|---|
| | Singulāris | | |
| 1-я | fu-**ĕri**-**m** | afu-**ĕri**-**m** | potu-**ĕri**-**m** |
| 2-я | fu-**ĕri**-**s** | afu-**ĕri**-**s** | potu-**ĕri**-**s** |
| 3-я | fu-**ĕri**-**t** | afu-**ĕri**-**t** | potu-**ĕri**-**t** |
| | Plurālis | | |
| 1-я | fu-**erĭ**-**mus** | afu-**erĭ**-**mus** | potu-**erĭ**-**mus** |
| 2-я | fu-**erĭ**-**tis** | afu-**erĭ**-**tis** | potu-**erĭ**-**tis** |
| 3-я | fu-**ĕri**-**nt** | afu-**ĕri**-**nt** | potu-**ĕri**-**nt** |

## Plusquamperfectum conjunctivi activi

Plusquamperfectum conjunctīvi actīvi (запрошлы час умоўнага ладу незалежнага стану) утвараецца ад асновы perfectum з дапамогай суфікса **-issē-** і асабовых канчаткаў actīvi (незалежнага стану):

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Аснова perfectum** | + | **-issē-** | + | **асабовыя канчаткі actīvi** |

З а ў в а г а. У 1 *sg*. канчатак -**m**.

**Узор спражэння**
**laudo, āvi, ātum, 1 (аснова perfectum: laudāv-);**
**scribo, psi, ptum, 3 (аснова perfectum: scrips-)**

| Асоба | laudo, 1 — *хваліць* | scribo, 3 — *пісаць* |
|---|---|---|
| | Singulāris | |
| 1-я | laudav-**isse**-**m** | scrips-**isse**-**m** |
| 2-я | laudav-**isse**-**s** | scrips-**isse**-**s** |
| 3-я | laudav-**isse**-**t** | scrips-**isse**-**t** |
| | Plurālis | |
| 1-я | laudav-**issē**-**mus** | scrips-**issē**-**mus** |
| 2-я | laudav-**issē**-**tis** | scrips-**issē**-**tis** |
| 3-я | laudav-**isse**-**nt** | scrips-**isse**-**nt** |

З а ў в а г а. Формы plusquamperfectum conjunctīvi actīvi трэба адрозніваць ад форм infinitīvus perfecti actīvi, якія таксама ўтвараюцца з дапамогай суфікса -**isse**: laudav-**isse**-**m** (прысутнічае асабовы канчатак), але laudav-**isse** (асабовы канчатак адсутнічае).

**Plusquamperfectum conjunctīvi**
**дзеяслова sum, esse — *быць* і вытворных**

Утвараецца, як у правільных дзеясловаў:

| Асоба | sum, fui, —, esse *быць* | absum, afui, —, abesse *адсутнічаць* | possum, potui, —, posse *магчы* |
|---|---|---|---|
| | Singulāris | | |
| 1-я | fu-**isse**-**m** | afu-**isse**-**m** | potu-**isse**-**m** |
| 2-я | fu-**isse**-**s** | afu-**isse**-**s** | potu-**isse**-**s** |
| 3-я | fu-**isse**-**t** | afu-**isse**-**t** | potu-**isse**-**t** |
| | Plurālis | | |
| 1-я | fu-**issē**-**mus** | afu-**issē**-**mus** | potu-**issē**-**mus** |
| 2-я | fu-**issē**-**tis** | afu-**issē**-**tis** | potu-**issē**-**tis** |
| 3-я | fu-**isse**-**nt** | afu-**isse**-**nt** | potu-**isse**-**nt** |

## Галоўныя і гістарычныя часы

Усе часы падзяляюцца на галоўныя (няпрошлыя) і гістарычныя (прошлыя):

| Галоўныя часы | Гістарычныя часы |
|---|---|
| praesens | perfectum |
| futūrum I | imperfectum |
| futūrum II | plusquamperfectum |

## Даданыя сказы са злучнікамі *ut, ne*

### Даданыя сказы мэты

Далучаюцца злучнікамі ut (fināle) — *каб*, ne (fināle) — *каб не*. Адказваюць на пытанне *з якой мэтай?* Ужываецца: а) praesens conjunctīvi пасля галоўных часоў; б) imperfectum conjunctīvi пасля гістарычных часоў: Discipŭlus multos libros legit (*praes. ind.*), ut bene discat (*praes. conj.*). — *Вучань чытае шмат кніг* (*з якой мэтай?*), *каб добра вучыцца* (= *каб ён добра вучыўся*). Discipŭlus multos libros legēbat (*imperf. ind.*), ut bene discĕret (*imperf. conj.*). — *Вучань чытаў шмат кніг*, *каб добра вучыцца* (= *каб ён добра вучыўся*).

### Даданыя дапаўняльныя сказы

1. **Даданыя дапаўняльныя сказы пры дзеясловах са значэннем імкнення і жадання.** Далучаюцца злучнікамі ut (objectīvum) — *каб*, ne (objectīvum) — *каб не*. Адказваюць на пытанні ўскосных склонаў. Ужываецца: а) praesens conjunctīvi пасля галоўных часоў; б) imperfectum conjunctīvi пасля гістарычных часоў: Discipŭlus studet (*praes. ind.*), ut bene discat (*praes. conj.*). — *Вучань імкнецца* (*да чаго?*) *добра вучыцца* (= *каб ён добра вучыўся*). Discipŭlus studēbat (*imperf. ind.*), ut bene discĕret (*imperf. conj.*). — *Вучань імкнуўся добра вучыцца* (= *каб ён добра вучыўся*).

2. **Даданыя дапаўняльныя сказы пры дзеясловах і выразах са значэннем боязі.** Далучаюцца злучнікамі ne — *што*, *каб не*, *як бы не* (дзеянне непажаданае); ne non, ut — *што не* (дзеянне пажаданае). Ужываецца: а) praesens conjunctīvi пасля галоўных часоў; б) imperfectum conjunctīvi пасля гістарычных часоў: Timeo (*praes. ind.*), ne veniat (*praes. conj.*). — *Я баюся*, *што ён прыйдзе/каб ён не прыйшоў/як бы ён не прыйшоў*. Timēbat (*imperf. ind.*), ne non venīret (*imperf. conj.*). — *Я баяўся*, *што ён не прыйдзе.*

### Даданыя сказы выніку

Далучаюцца злучнікамі ut (consecutīvum) — *так што*, *што*, *каб*, ut non — *так што не*, *што не*, *каб не*. У галоўным сказе могуць ужывацца займеннікі is, hic, talis — *такі*; tantus — *такі вялікі*, прыслоўі ita, sic — *так*; tam — *настолькі*; adeo — *да такой ступені* і г. д. Ужываюцца: а) praesens conjunctīvi пасля галоўных часоў; б) imperfectum conjunctīvi пасля гістарычных часоў: Discipŭlus multos libros legit (*praes. ind.*), ut optĭme discat (*praes. conj.*). — *Вучань чытае шмат кніг*, *так што ён выдатна вучыцца*. Discipŭlus

tantos libros legēbat (*imperf. ind.*), ut bene discĕret (*imperf. conj.*). — *Вучань чытаў так шмат кніг, што вучыўся выдатна.*

**Даданыя паясняльныя сказы**

Далучаюцца злучнікамі ut (explicatīvum) — *што*, *каб*, ut non — *што не*, *каб не*. Паясняюць выраз агульнага характару, які ўтрымліваецца ў галоўным сказе: est, fit — *бывае*; accĭdit, evĕnit — *здараецца*; fiĕri (non) potest — (*не*) *можа быць*; sequĭtur — *варта*, трэба; mos est — *ёсць звычай*, lex est — *ёсць закон* і г. д. Ужываецца: а) praesens conjunctīvi пасля галоўных часоў; б) imperfectum conjunctīvi пасля гістарычных часоў: Accĭdit (*praes. ind.*), ut discipŭlus male discat (*praes. conj.*). — *Здараецца, што вучань дрэнна вучыцца.* Accidēbat (*imperf. ind.*), ut discipŭlus male discĕret (*imperf. conj.*). — *Здаралася, што вучань дрэнна вучыўся.*